**Да юбілею Веры Пола (1901–1989)**

Гісторыю тэатра імя Я. Купалы нельга ўявіць без Веры Мікалаеўны Пола. Прызнаны майстар купалаўскай сцэны, яна належыць да кагорты тых, хто быў пачынальнікам першага тэатра рэспублікі, стваралі яго ўсенародную славу.

Нарадзілася В.М. Пола ў Мінску ў сям'і настаўніка і ўжо ў перыяд вучобы ў гімназіі захаплялася тэатрам, іграла ў аматарскіх спектаклях. У 1922 г. яна паступіла ў маладзёжную студыю пры Першым беларускім дзяржаўным драматычным тэатры (цяпер Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы), якой кіраваў вядомы педагог, драматург і рэжысёр Е. Міровіч. У перыяд вучобы Пола выступала ў тэатры ў эпізадычных ролях, але найбольшую вядомасць у той перыяд яна атрымала як артыстка эстрады, выканаўца беларускіх народных песень.

У сярэдзіне 30-х гг. жыццёвыя сцежкі прывялі В. Пола ў Новасібірскі тэатр "Чырвоны факел", дзе яна заваявала любоў і прызнанне гледачоў. Гэта зразумела, бо іграла яна адметна ярка.

Але Пола пацягнула зноў на Радзіму, у свой родны калектыў. Тут яна неўзабаве стварыла вобраз Кацярыны ў "Партызанах" К. Крапівы – адзін з лепшых у яе творчасці. Нездарма ў 1940 г. у час Першай дэкады беларускага мастацтва ў Маскве маскоўская крытыка вылучыла яе Кацярыну як самы выразны і запамінальны вобраз з ліку адмоўных персанажаў. У 1944 г. пасля вяртання франтавой брыгады тэатра з фронту ў Томск, дзе тады працаваў тэатр, В. Пола стварыла выдатны вобраз Лябёдкінай у "Познім каханні" А. Астроўскага і сваю неўміручую Агату ў "Паўлінцы". Здольнасць актрысы ствараць цікавыя, рознапланавыя вобразы і ў той жа час нідзе не паўтарацца, асабліва шырока раскрылася ў пасляваенны час. На гэты перыяд выпадае найбольшая колькасць яе сцэнічных удач. Тут і вяртлявая машыністка Піпіца з сатырычнай камедыі грэчаскага драматурга Дз. Псатаса "Патрабуецца лгун", і сквапная пані Астроўска з п'есы Хайноўскага "Зыбучыя пяскі", і гарэзлівая Даратэя (Дуэння) з п'есы Р. Шэрыдана "Дзень цудоўных падманаў", і ваяўнічая Пані міністэрша з аднайменнай п'есы Б. Нушыча, і Карміцелька ў "Рамэа і Джульеце" У. Шэкспіра. Крытыка адзначала ўдачу актрысы ў ролях Дуэнні і Карміцелькі, вылучала яе майстэрства выканання ў шэкспіраўскім спектаклі як новае слова ў трактоўцы вобраза. Нельга абысці і бліскучае выкананне В. Пола ролі Жыўкі Попавіч – Пані міністэршы, вобраз якой актрыса падавала ў гратэскавых, сатырычна гіпербалізаваных фарбах. З рускай класікі выбітнымі можна назваць вобраз хціvай і хітрай прарочыцы, варажбіткі Манефы ў спектаклі "На ўсялякага мудраца хапае прастаты" і асабліва вобраз Кармінай – у "Жаніцьбе Бялугіна" А. Астроўскага.

За сваё сцэнічнае жыццё актрыса сыграла звыш 120 роляў, але асаблівую папулярнасць яна набыла дзякуючы творам беларускай драматургіі: Малання з "Кар'еры таварыша Брызгаліна" Е. Міровіча, Сцепаніда з "Пагібелі воўка" Э. Самуйлёнка, Кацярына, Ганна Паўлаўна, Паўліна Бохан у "Партызанах", "Хто смяецца апошнім", "Пяюць жаваранкі" К. Крапівы (Дзяржаўная прэмія СССР 1952 г. за апошнюю ролю), Аўдоцця з "Твайго светлага шляху" А. Маўзона, Сухадол з "Сэрца на далоні" І. Шамякіна… І незабыўная Агата з "Паўлінкі" Я. Купалы. Вобраз, створаны Верай Мікалаеўнай, стаў сцэнічнай класікай.

Акрамя тэатра яна таксама знялася ў кіно: Алеська ("Хвоі гамоняць)", Агата ("Паўлінка"), Паўліна Бохан ("Пяюць жаваранкі)", Мальвіна ("Несцерка").

Актрыса шматгранная і яркая, яна з асаблівым імпэтам і прыхільнасцю выконвала ролі характарныя і камедыйна-сатырычныя. І што б ні іграла, якіх бы перабольшанняў і гіпербал не дасягала ў сцэнічным паказе, яна ніколі не адрывалася ад фундаментальнай жыццёвай асновы.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2000 г.